Падтрымай "Вясну" на PATREON

У Бабруйску затрыманую Галіну Смірнову ўжо 6 гадзін трымаюць у міліцыі

дапоўнена

12.03.2017 **Тэгі**: пераслед, затрыманні



Галіна Смірнова, Бабруйск.

У Бабруйску 12 сакавіка напярэдадні “Марша недармаедаў” затрыманая кіраўніца аддзялення прафсаюза РЭП і актывістка АГП **Галіна Смірнова,** якая падавала заяўку на правядзенне масавага мерапрыемтва, якое мясцовыя ўлады не дазволілі.

Затрыманне адбылося ля пад'езда дома, у якім жыве актывістка. Пасля яе даставілі ў аддзяленне міліцыі для складання пратакола, куды ў якасці прадстаўніка дапусцілі яе мужа **Аляксандра**. Прычым адвезлі ў самы дальні апорны пункт міліцыі №11, што знаходзіцца на ўскрайку Бабруйска (Прыбярэзінскі бульвар, 45).

Затрыманне доўжыцца амаль 6 гадзін. Аднак за гэты час супрацоўнікі міліцыі не здолелі скласці пратакол адміністратыўнага парушэння, які павінен быць складзены цягам трох гадзін пасля затрымання. Вінавацяць Галіну Смірнову паводле ч.2 арт. 23.34 КаАП, але пры гэтым супрацоўнікі міліцыі не могуць вызначыцца - было ёй уручана ўведамленне з выканкама пра адмову ў правядзенні масавага мерапрыемства ці не. Сама яна адказ на гэтае пытанне даваць адмаўляецца. Яе муж, паколькі з'яўляецца прадстаўніком затрыманай, не можа выступаць у якасці сведкі і даваць падобныя паказанні. Таму ў адміністратыўным пратаколе дагэтуль запоўнена толькі шапка. Пра гэта актывістка паведаміла ў тэлефанаванні праваабаронцу **Барысу Бухелю**. Яна таксама распавяла, што пры складанні пратаколу апытання яна хадайнічала пра ўласнаручную дачу паказанняў, але ёй у гэтым было адмоўлена. Супрацоўнікі міліцыі не хочуць запісваць тое, што ім кажа жанчына.

Галіна Смірнова абураецца, што столькі часу знаходзіцца ў апорным пункце без ежы. Калі яна паведаміла пра гэта на тэлефонны нумар міліцыі, ёй зрабілі заўвагу, што як гэта яна скардзіцца ў міліцыю на міліцыю.

Твитнуть









Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17

ГАЛОЎНАЕ







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

"Бяляцкі, прасі літасці!" У Швецыі прадставяць спектакль-чытку паводле твораў Бяляцкага і Знака

Валерыя Цапкалу завочна асудзілі да 17 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму (дапоўнена)

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022



ВЫДАННІ

‹ ›



Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY